**С. А. Паўлава,** *прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫ МЕНЕДЖМЕНТ»

Звяртанне да інавацыйнай складаючай у сістэме адукацыі з'яўляецца адной з перадумоў вырашэння шматлікіх праблем. Дамінуючай каштоўнасцю інавацыйнай бібліятэчнай адукацыі становіцца развіццё і самаразвіццё асобы, выхаванне ў будучых бібліятэкараў якасцей, адэкватных асобе бібліятэкара-інаватара (самаматываванасць, ініцыятыўнасць, развітасць уяўлення, інавацыйная ўспрымальнасць, рэфлексіўнасць і інш.), што закладзена ў кампетэнтнаснай мадэлі спецыяліста.

Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы прадугледжвае фарміраванне ў будучых бібліятэкараў кола кампетэнцый, неабходных для эфектыўнага здзяйснення прафесійнай дзейнасці. У гэтай сувязі важнае значэнне набывае фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі як ключавога элемента прафесійнай кампетэнтнасці будучых бібліятэкараў падчас выкладання бібліятэказнаўчых дысцыплін. Праблема фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці бібліятэкара не атрымала комплекснага даследавання і аналізу ў навуковых працах даследчыкаў. Асобныя аспекты яе знайшлі адлюстраванне ў працах беларускіх навукоўцаў (С. В. Зыгмантовіч, Н. У. Клімянковай, С. А. Паўлавай). Камунікатыўная прырода бібліятэчнай прафесіі закранаецца ў даследаваннях, звязаных з падрыхтоўкай кадраў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы (С. В. Зыгмантовіч, В. Е. Лявончыкаў, І. Б. Стралкова і інш.). Сярод Расійскіх навукоўцаў, якія вывучалі гэту праблему з пункту гледжання падрыхтоўкі кадраў, трэба адзначыць працы Н. В. Збароўскай, Э. Р. Сукіясяна, С. І. Галаўко і інш.

У слоўніках, навуковых працах педагогаў, псіхолагаў, бібліятэказнаўцаў існуе мноства трактовак паняцця «камунікатыўная кампетэнтнасць», але адназначнага тлумачэння няма. У бібліятэчнай сферы таксама яшчэ не поўнасцю асэнсавана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сутнасць камунікатыўнай кампетэнтнасці. Найбольш прадуктыўна і поўна гэта паняцце трактуецца ў працах Т. Е. Ісаевай, якая прапануе разумець камунікатыўную кампетэнтнасць як складанае па структуры і цэласнае па арганізацыі ўтварэнне, што забяспечвае паспяховасць здзяйснення асноўных задач стасункаў і самарэалізацыі асобы, якія знаходзяць адлюстраванне ў лінгвістычным уменні; выкананне спецыфічных сацыяльна-культурных норм паводзін і псіхалагічных законаў устанаўлення кантактаў у працэсе зносін паміж людзьмі, падтрымцы добразычлівай атмасферы, развіцця эмацыянальна-пачуццёвай сферы асобы. У гэтым працэсе вербальнага і невербальнага ўзаемадзеяння, заснаваным на прадуктыўным разуменні, замацоўваюцца і развіваюцца міжасабовыя адносіны, адбываецца перадача і абмен ведамі, думкамі, перажываннямі, а галоўнае – культурна-маральнымі каштоўнасцямі і вынікамі дзейнасці, увасобленымі ў матэрыяльную і духоўную культуру адпаведна сацыяльным нормам і ўмовам здзяйснення дзейнасці [1, с. 57].

У гэтым вызначэнні ў поўнай ступені адлюстравана Камунікатыўная функцыя бібліятэк, а таксама прагладаюцца ўсе кампаненты сістэмы камунікатыўнай кампетэнтнасці: каштоўнасна-асобасны – уключае гуманістычныя арыентацыі, камунікатыўныя каштоўнасці асобы, сукупнасць асабовых якасцей, якія забяспечваюць гатоўнасць да дыялогу; кагнітыўны – аб’ядноўвае веды аб заканамернасцях стасункаў, якія з’яўляюцца асновай камунікатыўнай кампетэнцыі; аперацыйна-дзеясны – уключае ўменні і навыкі стасункаў, абумоўленныя культурай узаемадзеяння. Структурныя кампаненты камунікатыўнай кампетэнтнасці ўзаемазвязаныя і ўзаемаабумоўленыя. У большай ступені ў камунікатыўнай кампетэнтнасці адлюстроўваюцца дзейнасць і рэфлексія суб’ектаў педагагічнага ўзаемадзеяння. Таму рэфлексіўны кампанент уключаецца ў мадэль кампетэнтнасці і разглядаецца ў якасці скразнога элемента, які забяспечвае праламленне асабовых асаблівасцей суб’екта [3, с. 226].

Арганізацыя рэфлексіўнай дзейнасці па ўзаемадзеянні ўдзельнікаў педагагічнага працэсу – адна з галоўных умоў аптымальнага развіцця, крытэрый эфектыўнага педагагічнага працэсу, яго асабовай арыентацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэфлексія – гэта асобасная якасць, якая ўяўляе сабой найважнейшы фактар развіцця асобы, фарміравання камунікатыўнай культуры асобы. Па сваёй сутнасці педагагічная дзейнасць мае рэфлексіўны характар, які праяўляецца ў тым, што, арганізуючы дзейнасць студэнтаў, педагог імкнецца глядзець на сябе і свае дзеянні вачыма сваіх падапечных, улічваць іх погляды, уяўляць іх унутраны свет, іх ацэнку сваёй дзейнасці, імкнецца зразумець іх эмацыянальны стан. Будуючы сваё ўзаемадзеянне, педагог ацэньвае сябе як удзельніка гэтага дыялогу, стварае ўмовы міжсуб'ектных адносін удзельнікаў педагагічнага працэсу. У працэсе педагагічнай рэфлексіі педагог ідэнтыфікуе сябе з той педагагічнай сітуацыяй, якая склалася са студэнтам, з калегам, у розных мадэлях педагічнай сітуацыі. Рэфлексія ў педагагічным працэсе – гэта працэс і вынік фіксавання суб'ектам (удзельнікамі педагагічнага працэсу) стану свайго развіцця і прычын гэтага [2, с. 124]. Асноўным кампанентам у структуры рэфлексіі ў педагагічным працэсе, па нашым меркаванні, з'яўляецца рэфлексія студэнтамі сваёй дзейнасці, свайго развіцця. Менавіта гэты кампанент робіць мэтазгодным рэфлексію дзейнасці педагога, рэфлексію ўзаемадзеяння. Важнай складаючай гэтага працэсу з'яўляецца ўжыванне адпаведных арганізацыйных форм навучальнага працэсу, інавацыйных педагагічных сістэм і тэхналогій, методык актыўнага навучання ў прафесіянальнай падрыхтоўцы студэнтаў.

Пры выкладанні дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент» у ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія садзейнічаюць развіццю ў студэнтаў крытычнага мыслення, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, пошуку і вызначэнню асобасных сэнсаў і каштоўнасных адносін, фарміраванню камунікатыўнай кампетэнцыі, вылучаецца тэхналогія кантэкстнага навучання, якая распрацавана з улікам асноўных заканамернасцей тэорыі праблемнага навучання і дзейснага падыходу. У кантэкстнай тэхналогіі выкарыстоўваюцца метады навучання, якія імітуюць натуральныя формы арганізацыі чалавечых паводзін: семінар па метадзе груп спаборніцтва нагадвае калектыўную форму арганізацыі семінара па прынцыпе круглага стала. На такім семінары здзяйсняецца супрацоўніцтва і ўзаемадапамога, кожны студэнт мае права на інтэлектуальную актыўнасць, зацікаўлены ў дасягненні агульнай мэты семінара, прымае ўдзел у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калектыўнай выпрацоўцы вынікаў і рашэнняў. Ва ўмовах сумеснай дзейнасці студэнт займае актыўную пазіцыю.

Найбольш адэкватна прынцып круглага стала рэалізуецца на семінары-дыскусіі, у працэсе якога высвятляюцца тэарэтычныя і практычныя праблемы дысцыпліны. На абмеркаванне выносяцца найбольш актуальныя пытанні вывучаемай дысцыпліны. Напрыклад, тэма «Сацыяльна-псіхалагічныя аспекты кіравання бібліятэкай», дзе на аснове вывучэння тэарэтычных крыніц па праблеме студэнты уключаюцца ў дыскусію па пытаннях: «Ці можа эфектыўна функцыянаваць арганізацыя, у якой адсутнічаюць канфлікты?», «Чым выклікаецца і як праяўляецца ўнутрыасобасны канфлікт?», «Якія фактары садзейнічаюць узнікненню арганізацыйных канфліктаў? Якія метады можна выкарыстоўваць для кіравання канфліктамі ў бібліятэцы?» і г. д. Кожны з удзельнікаў дыскусіі павінен вучыцца дакладна фармуляваць свае думкі ў выступленні, актыўна адстойваць свой пункт гледжання, аргументавана весці спрэчкі. Неабходнай умовай разгортвання прадуктыўнай дыскусіі з'яўляюцца асабовыя веды, якія набываюцца студэнтамі на лекцыях і ў самастойнай рабоце. Важна навучыць студэнтаў культуры стасункаў, сфарміраваць сістэму правіл моўных і нямоўных паводзін у розных камунікатыўных сітуацыях. Часткай семінарадыскусіі могуць быць элементы метадаў рэфлексіўнай дзейнасці: «Завяршы фразу», «Ключавое слова» і інш. Глыбокае засваенне ведаў на семінары дасягаецца за кошт таго, што студэнт дабывае іх асабовай працай, таму лепш разумее і засвойвае.

У сістэме выкладання дысцыпліны немалаважнае месца займаюць практычныя заняткі, якія праводзяцца з выкарыстаннем тэхналогіі гульнявога навучання, актыўных метадаў навучання. Аналіз канкрэтных сітуацый у бібліятэчным калектыве праводзіцца па наступных пытаннях: стыль кіраўніцтва калектывам; алгарытм рашэння кіраўнічых праблем, мадэляванне ідэальнага кіраўніка; пераадоленне канфліктных сітуацый у бібліятэчным калектыве. Аналіз канкрэтных сітуацый – адзін з найбольш эфектыўных і распаўсюджаных метадаў арганізацыі актыўнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Ён развівае здольнасць да аналізу нерафініраваных жыццёвых і вытворчых задач. Кожная сітуацыя разбіраецца па пэўным алгарытме: студэнт павінен вызначыць, ці ёсць у ёй праблема, з чаго яна складаецца, абгрунтаваць свае адносіны да сітуацыі. Асноўная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мэта гэтага метаду – развіваюць аналітычныя здольнасці студэнтаў, праяўляць самастойнасць, ініцыятыву ў выпрацоўцы рашэнняў, развіваць камунікатыўныя ўменні. Гэта далёка не поўны пералік адукацыйных тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца пры выкладанні дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент» і ўмяшчаюцца ў сістэму праектнага навучання.

Галоўныя прыярытэты прадуктыўных педагагічных тэхналогій: дзейнасць, стасункі, дыялог, магчымасці самаадлюстравання, самарэалізацыя студэнтаў і педагогаў, працэсуальнасць, развіццё; рэфлексія студэнтамі асабовага вопыту творчай дзейнасці, што дазволіць павысіць узровень развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці будучых бібліятэкараў.

1. *Исаева, Т. Е.* Классификация профессионально-личностных компетенций вузовского преподавания / Т. Е. Исаева // Педагогика. – 2006. – № 9. – С. 55–60.

2. *Кашлев, С. С.* Интерактивные методы обучения : учеб.-метод. пособие / С. С. Кашлев. – Минск : ТетраСистемс, 2011. – 224 с.

3. *Угликова, И. В.* Моделирование социокультурной компетентности студента университета классического типа / И. В. Угликова // Вестн. Могилев. гос. ун-та им. А. Кулешова. – 2009. – № 4. – С. 223 – 228.

**Ю. А. Пераверзева,**
*дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат педагагічных навук*

## ВЫКАРЫСТАННЕ МАГЧЫМАСЦЕЙ СЕТКАВАЙ КАМУНІКАЦЫІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАГА ПРОФІЛЮ

Вышэйшая бібліятэчна-інфармацыйная адукацыя рэалізуецца ў межах пэўнай прасторы, якая можа разглядацца, папершае, у маштабах адукацыйнай сістэмы краіны і, па-другое, на лакальным узроўні структуры ва ўстанове вышэйшай адукацыі, на факультэце. Відавочна, што гэтыя ўзроўні ўзаемазвязаны і ўзаемна абумоўліваюць адзін аднаго. Таму падрыхтоўка бібліятэчнага спецыяліста павінна адпавядаць канцэптуальна новым падыходам да вучэбна-метадычнай дзейнасці, якія сёння фарміруюцца ў вышэйшай школе і арыентаваны на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ